# «Сумленна, чэсна жыць, тварыць...»

**МАЗЫРСКІ ПАЭТ Васіль АНДРЫЕЎСКІ даўно вядомы нашым чытачам. Ён адразу выклікае асацыяцыі з чалавекам творчым, таленавітым, патрабавальным да сябе і іншых. Напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы ў Мазырскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя А. С Пушкіна адбылася сустрэча з паэтам на прэзентацыі яго кнігі «Колкі снег жыцця».**




## «КОЛКІ СНЕГ ЖЫЦЦЯ»

Над кнігай працавалі рэдактар і аўтар прадмовы **Васіль Жуковіч**, мастак **Марына Адосій**, дызайн вокладкі зрабіў **Уладзімір Пінтусаў**. Убачыла свет кніга ў 2025 годзе ў сталічным выдавецтве «Каўчэг». Яна адрозніваецца ад папярэдніх выданняў аўтара, бо складаецца толькі з чатырохрадкоўяў. Менавіта чатырохрадкоўі, а іх у кнізе аж семдзесят, паказваюць уменне майстра мастацкага слова максімальна коратка выказаць істотнае.

Вось адно з іх:

*Народ мой славіцца гасціннасцю*
*(І так было ва ўсе часы),*
*І працавітасцю, і сціпласцю,*
*І мовай дзіўнае красы!*

## ЖЫЦЦЁВЫ І ТВОРЧЫ ШЛЯХ

Васіль Андрыеўскі нарадзіўся 20 кастрычніка 1967 года ў вёсцы Града Калінкавіцкага раёна. Скончыў Юравіцкую сярэднюю школу, а ў 1989 годзе – філалагічны факультэт Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Надзеі Канстанцінаўны Крупскай.

Працаваў карэспандэнтам газеты «Камуніст Палесся» (зараз «Жыццё Палесся»), выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Мазырскім прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 68 будаўнікоў, галоўным бібліятэкарам Мазырскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна, навуковым супрацоўнікам Мазырскага краязнаўчага музея.

Зараз – супрацоўнік Мазырскага аддзела Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

Друкавацца паэт пачаў з 1987 года. Першы надрукаваны верш «Родны край» быў размешчаны на старонках «Прыпяцкіх хваляў» пры мясцовай газеце «Камуніст Палесся», пазней ён быў пакладзены на музыку **Аляксандрам Аўсіюком**.

## ПЕРШЫЯ КРОКІ Ў ЛІТАРАТУРЫ

Васіль Рыгоравіч распавядае: «Мне пашчасціла ў сваім жыцці бачыць і слухаць класікаў беларускай літаратуры **Івана Навуменку**, **Івана Чыгрынава**, **Івана Шамякіна**, **Янку Брыля**. З апошнім удалося нават крыху паразмаўляць. Гэта адбылося ў 1990 годзе ў Доме творчасці пісьменнікаў «Іслач», дзе я прымаў удзел у рабоце семінара маладых літаратараў нашай краіны. Менавіта гэта і быў пераломны момант у творчасці. З'явілася больш адказнае стаўленне да працы з мастацкім словам».

Вершы Васіля Рыгоравіча змешчаны ў кнігах «Памяць», «Мазыршчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны», у часопісах «Полымя», «Маладосць», «Вясёлка», «Вожык», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» і іншых беларускіх перыядычных выданнях.




**Васіль Андрыеўскі – складальнік, рэдактар і адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў вершаў «Ты, Мазыр, – мой Парнас», «Спелы ранак», «Сонца над буслянкай», «Прыпяцкія хвалі», а таксама камплекта мастацкіх паштовак «Мазыра прывабная краса», выпушчанага ў 2002 годзе.**

## РЫФМЫ, ЯКІЯ КРАНАЮЦЬ СЭРЦЫ

Васіль Андрыеўскі гаворыць: «Хто аказаў уплыў на фарміраванне мяне як чалавека і паэта? Як асобы – бацькі, школьныя настаўнікі, выкладчыкі інстытута. А як творцы – пісьменнікі, калегі па пяру».

На пытанне, ці важна паэту друкавацца, адказаў: «Канешне, важна, каб данесці сваё паэтычнае слова да сэрцаў чытачоў». І дадаў: «Так як зараз ідзе Год беларускай жанчыны, рады, што прысвяціў не адзін верш нашым таленавітым землячкам – **Марыне Літвінчук** і **Вользе Худзенка** – праслаўленым вясляркам-байдарачніцам, а таксама дзяўчатам Мазырскай жаночай прафесіянальнай валейбольнай каманды «Жамчужына Палесся». І працытаваў радкі, уключаныя ў новую кнігу:

*Любімая «Жамчужына Палесся», –*
*Спартыўны непаўторны*
*дзіўны свет!*
*З балельшчыкамі разам ты*
*імкнешся*
*Да новых перамог, да новых мэт!*

> **Гэта факт!**
>
> **У 2001 г. убачыў свет першы асабісты зборнік вершаў Васіля Андрыеўскага «Пад літасцю нябёс», у 2007 г. – зборнік вершаў «Вербніца». У 2017 г. выйшлі адразу два зборнікі вершаў: «Глядзіць спадзеўна Багародзіца» і «Кахання гаючы агонь». «Нахлыне думка навальніцай» – у 2024 г.**

Васіль Рыгоравіч – заўзяты балельшчык жаночай валейбольнай каманды. Акрамя спорту, паэт любіць бавіць час на рыбалцы і ў падарожжах па Беларусі. А яшчэ – наведвае прэм'ерныя спектаклі нашага драматычнага тэатра і прысвячае яму радкі:

*У жыцці турботна-хаатычным*
*Я сяброўству нашаму так рад,*
*О Мазырскі, слаўны, драматычны,*
*Блаславёны Мележам тэатр!*

## МІЛАГУЧНАЯ ПАЭЗІЯ

Многія вершы паэта пакладзены на музыку нашым мазырскім бардам, кампазітарам і выканаўцам **Міхаілам Копачам**.

У паўсядзённым жыцці Васіль Рыгоравіч размаўляе пераважна па-беларуску, але на працы, напрыклад, даводзіцца выкарыстоўваць і другую дзяржаўную мову. На пытанне аб творчых планах паэт адказаў так: «Вядома, ёсць творчыя задумы, якія хацелася б рэалізаваць».

А потым прачытаў такое чатырохрадкоўе:

*Хачу, каб хтосьці паўтарыў*
*І не аднойчы: шчасце – гэта*
*Сумленна, чэсна жыць, тварыць*
*Прад Небам, прад сабой,*
*прад светам.*

Ёсць у кнізе прысвячэнне і нашай газеце:

*Крочыш ад поспеху да перамогі,*
*Пішаш адметна гісторыю краю.*
*Гэтым і вабіш падпісчыкаў строгіх,*
*Дружбу з табою і я не губляю.*

Жадаем Васілю Рыгоравічу моцнага здароўя, творчага даўгалецця, новых вершаў і кніг.

**Марта МАРОЗ. Фота аўтара і Аляксандра САЛАДКОВА**

Мароз, М. «Сумленна, чэсна жыць, тварыць...» / М. Мароз // Жыццё Палесся. - 2026. - 20 лютага. - С. 8.